Навіны тваёй Alma Mater

Настаўнік

Выдаецца з кастрычніка 1972 г. Аўторак, 22 верасня 2020 года № 10 (1248)

• Навіны БДПУ

У АПОШНЮЮ суботу верасня на аграбіястанцыі БДПУ пройдзе каляровае свята, прысвечанае сонечнай восеньскай гародніне — гарбузу. У чарговы раз мерапрыемства збярэ разам студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта. Як і ў мінулыя гады, аб'яднаныя карпаратыўным духам удзельнікі фэсту весела і крэатыўна адзначаць заканчэнне сезона ўраджаю. Іх чакае насычаная праграма: спартыўныя гульні «Гарбузовыя забаўкі», конкурсы дызайнерскага адзення «Стылёвая восень», на лепшы творчы нумар «Восень каляровая», па стварэнні арт-аб'екта «Парасонавы настрой», на «Самы важкі» гарбуз, а таксама забавы на свежым паветры. А яшчэ — смачны пачастунак ад рэктарата: каша з гарбузом і тушонкай.



ВА ЎНІВЕРСІТЭЦЕ з розніцай у адзін дзень (10 і 11 верасня) прайшлі два вельмі блізкія па тэматыцы мерапрыемствы — адукацыйны квэст «Мэты ўстойлівага развіцця: Шлях наперад 2.0» і ролевая гульня «Зялёная інфраструктура» ў рамках праекта «Школа зялёнага валанцёра». У нефармальнай абстаноўцы студэнты факультэтаў і інстытутаў разбіраліся ў прынцыпах і стратэгіях устойлівага развіцця, вывучалі асновы праектнай дзейнасці, накіраванай на вырашэнне канкрэтных экалагічных, эканамічных і сацыяльных задач, паляпшэнне інфраструктуры ўніверсітэцкіх тэрыторый. Арганізатарамі мерапрыемстваў выступілі Каардынацыйны цэнтр «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» БДПУ і *Green Office BSPU*.

ЗАКЛЮЧНЫ этап конкурсу «Парад эсэ "Міфы і рэальнасць сучаснай навукі"», які праводзіцца ў рамках плана работы СНТ БДПУ, адбыўся ў рэжыме анлайн. Падчас прэзентацыі і абароны сваіх прац аўтары выказалі арыгінальны пункт гледжання на даследуемыя навуковыя праблемы, а таксама адказалі на пытанні членаў журы. Па выніках былі вызначаны лепшыя выступленні. Так, у намінацыі «Актуальнасць і парадаксальнасць міфа» гэта эсэ Алены Буіклы. «Шматаспектны погляд на праблему» — Веранікі Ермалінскай, «Абгрунтаванасць прапанаванага рашэння» — Вольгі Сірошык. Прарэктар па навуковай рабоце БДПУ Ганна Васільеўна Торхава падкрэсліла, што дадзеная форма працы дазволіла студэнтам у поўнай меры праявіць эрудыцыю, творчыя здольнасці, аўтарскае бачанне і разуменне праблемы. Конкурсныя работы паказалі, наколькі шматаспектнай з'яўляецца тэма, абраная студэнцкім навуковым таварыствам.



НА ФАКУЛЬТЭЦЕ эстэтычнай адукацыі БДПУ ў анлайн-рэжыме адбылося сумоўе са студэнтамі Лаянскага педагагічнага ўніверсітэта (Кітай) у рамках рэалізацыі дагавора аб супрацоўніцтве паміж дзвюма ўстановамі па сумеснай адукацыйнай праграме. У сумоўі па спецыяльнасці *«Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія»* прынялі ўдзел сямёра кітайскіх студэнтаў, якія прадэманстравалі камісіі ўзровень падрыхтоўкі па выканальніцкіх дысцыплінах (вакал, ігра на інструменце, дырыжыраванне, танец), веданне асноў тэорыі музыкі і валоданне рускай мовай. Акрамя таго, у размове прыняла ўдзел дацэнт Джу Цзынь. Яна агучыла далейшыя напрамкі работы са студэнтамі партнёрскага ўніверсітэта па падрыхтоўцы будучых настаўнікаў музыкі.



ДЗЕНЬ пісьменства — адна з важных традыцый Беларусі. Сёлета ў яго святкаванні прынялі ўдзел студэнты і выкладчыкі факультэта эстэтычнай адукацыі нашага ўніверсітэта. Для гасцей фестывалю, якія прымалі ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці скульптурнай кампазіцыі і раённага мастацкага музея імя В.К. Бялыніцкага-Бірулі ў Бялынічах, будучыя педагогі падрыхтавалі дэфіле ў гістарычных і традыцыйных народных строях беларусаў, што распрацавалі і пашылі ўласнымі рукамі. Студэнты таксама распавялі прысутным пра перавагі навучання на факультэце эстэтычнай адукацыі і ў БДПУ ў цэлым.

ДЗЕНЬ ВЕДАЎ У БДПУ: З ПАЧЫНАМ!

Для ўсіх танкаўцаў першы дзень восені – не проста пачатак новага навучальнага года, а сапраўднае свята! З асабліва прыўзнятым настроем сустракаюць яго першакурснікі – у новым для сябе статусе студэнтаў вядучага педагагічнага ўніверсітэта краіны. Выбраўшы самую высакародную прафесію ў свеце, кожны з іх атрымаў шанц стаць высакакласным спецыялістам – Настаўнікам з вялікай літары, удзячнасць да якога вучні пранясуць у сваіх сэрцах праз усё жыццё.

Святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню ведаў, адбыліся на ўсіх факультэтах і ў інстытутах нашага ўніверсітэта. Але больш за іншых пашчасціла прадстаўнікам факультэтаў прыродазнаўства, сацыяльна-педагагічных тэхналогій, фізіка-матэматычнага і гістарычнага. Іх прыйшоў асабіста павіншаваць рэктар БДПУ прафесар **А.І. Жук**. Звяртаючыся да студэнтаў, Аляксандр Іванавіч адзначыў:

— XXI стагоддзе называюць эпохай ведаў. І гэта заканамерна: поспех не толькі асобнага чалавека, але і дзяржавы ў цэлым наўпрост залежыць ад узроўню



падрыхтоўкі педагога, яго прафесіяналізму, уменняў і кампетэнцый — іншымі словамі, ад ведаў, якімі наш універсітэт шчодра дзеліцца са сваімі студэнтамі. Лічыцца таксама, што XXI стагоддзе — час развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу і чалавечага капіталу. Такім чынам, самымі паспяховымі будуць тыя краіны, сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў у якіх адпавядае запытам заўтрашняга дня. Таму БДПУ не толькі паспяхова ўкараняе ў адукацыйны працэс разнастайныя інавацыі, але і стварае ўмовы для самарэалізацыі студэнтаў, усебаковага развіцця творчай асобы.

Навукоўцы-футуролагі сцвярджаюць, што ў XXI стагоддзі найбольш запатрабаванымі будуць тры асноўныя прафесіі: *IT*-спецыялісты, урачы і настаўнікі. Я б паставіў прафесію педагога на першае месца, таму што ад таго, як сучасны настаўнік будзе спраўляцца са сваімі абавязкамі, залежыць, якога ўзроўню ўрачоў і айцішнікаў атрымае грамадства.



Дарагія першакурснікі! Звяртаючыся да вас у гэты асаблівы дзень, выказваю ўпэўненасць у правільнасці вашага выбару. Педагагічная прафесія, якую мы з вамі абралі душой і сэрцам, — самая важная і адказная місія на Зямлі. Мы выхоўваем маладое пакаленне, а значыць, ад нас залежыць будучыня і ўстойлівае развіццё нашай краіны. З пачаткам новага навучальнага года, дарагія сябры!

Наперадзе ў маладой змены БДПУ — незабыўныя студэнцкія гады. За гэты час *alma mater* дапаможа сваім выхаванцам не толькі набыць прафесію, але і знайсці надзейных сяброў, адкрыць у сабе новыя таленты. Так адбываецца заўсёды. Так адбылося і з тымі,



хто 1 верасня выйшаў на імправізаваную сцэну БДПУ ў холе вучэбнага корпуса № 3. Спецыяльна для першакурснікаў свае творчыя падарункі ў гэты святочны дзень падрыхтавалі: дуэт акардэаністаў у складзе прафесара **Уладзіміра Бубена** і старшага выкладчыка, удзельніка групы «Лепрыконсы» **Уладзіміра Федарука**; неаднаразовы пераможца танцавальных конкурсаў калектыў «Арт-Юніці»; папулярная беларуская група «Бай-сіці»; студэнт 3-га курса факультэта эстэтычнай



адукацыі, лаўрэат рэспубліканскіх вакальных конкурсаў **Уладзімір Аруцюнян**. У якасці зваротнай сувязі выступоўцы атрымалі бурныя апладысменты, усмешкі і праменьчыкі святла ад ліхтарыкаў, якія прысутныя запалілі як сімвал захаплення і еднасці.

Сябры! Вы — будучыя педагогі. Вы — маладыя і поўныя энергіі. Надышоў ваш час ствараць і крэатывіць! Яшчэ раз са святам, дарагія першакурснікі!



• Афіцыйная хроніка

У якіх умовах будзе праходзіць працэс навучання? Якія праекты ў рамках капітальных і бягучых рамонтаў рэалізаваны? Якія сацыяльна-бытавыя ўмовы створаны, у тым ліку для арганізацыі спартыўна-аздараўленчай і творчай дзейнасці студэнтаў? На гэтыя і іншыя пытанні даў грунтоўныя адказы прарэктар БДПУ **А.А. ЮШЧЫК**. Прапануем вытрымкі з даклада, з якім Андрэй Аляксандравіч выступіў перад членамі рэктарата БДПУ напярэдадні Дня ведаў.

— Завершаны комплекс работ у **вучэбным корпусе № 7** па паляпшэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы факультэта эстэтычнай адукацыі. Вынікам першага этапу капітальнага рамонту стала ўрачыстае адкрыццё майстэрні скульптуры і керамікі і харэаграфічнай залы ў канцы 2019 г. Другі этап уключаў рамонт 10 аўдыторый і стварэнне 13 музычных класаў для індывідуальных заняткаў з эфектыўнай сістэмай гукаізаляцыі сцен, столяў, дзвярных блокаў. Пасля яго завяршэння набыта новая мэбля, а ў рамках спонсарскай дапамогі ТАА «Фабрыка фартэпіяна» перадала факультэту 8 музычных інструментаў у мінулым годзе і 5 — у бягучым. Трэці этап прадугледжваў рамонт і аснашчэнне фоталабараторыі і спартыўнай залы-трансформера для заняткаў фітнесам, харэаграфіяй і іншымі спартыўнымі дысцыплінамі. Усё намечанае паспяхова выканана.



Закуплена таксама новае абсталяванне — музычны цэнтр, харэаграфічны станок, гімнастычная сценка і інш. Абноўленая матэрыяльная база факультэта эстэтычнай адукацыі дасць магчымасць БДПУ значна пашырыць экспарт адукацыйных паслуг.

Ва ўніверсітэце асаблівая ўвага надаецца развіццю творчых здольнасцей студэнцкай моладзі. У сістэме пазавучэбнай работы задзейнічана звыш 2500 студэнтаў — удзельнікаў 100 клубных фарміраванняў рознай накіраванасці. Таму рэктарат БДПУ прыняў рашэнне аб аднаўленні ў **інтэрнаце № 3** клуба «Юнацтва», які быў закрыты з-за аварыйнага стану памяшканняў на працягу 15 гадоў. За кошт бюджэтнага фінансавання выкананы бягучы рамонт актавай залы (288 м²), хола (108 м²), гардэроба (40 м²), лесвічнай пляцоўкі (23 м²). Інтэр'ер клуба афармлены ў каляровай гаме сімволікі БДПУ. Сапраўдным упрыгожаннем актавай залы сталі тры карціны вядомага мастака Беларусі Андрэя Смаляка, якія адрэстаўрыраваў загадчык кафедры мастацка-педагагічнай адукацыі факультэта эстэтычнай адукацыі прафесар **Г.В. Лойка**.

У чэрвені падчас сустрэчы рэктара БДПУ **А.І. Жука** і Міністра адукацыі **І.В. Карпенкі** было прынята рашэнне аб выдзяленні бюджэтных сродкаў на рамонт рэпетыцыйных залаў



клуба «Юнацтва», а таксама студыі гуказапісу, дзвюх грымёрак і пакояў для персаналу, санвузла і душавой. Гэты этап работ плануецца скончыць у кастрычніку.

На сённяшні дзень у інтэрнаце № 3 завершаны выгляд набылі цэнтральны ўваход у будынак і ў сталовую. Згодна з дызайн-праектам вядзецца рамонт вялікай і малой абедзенных залаў.

Выкананы рамонт актавай залы ў **вучэбным корпусе № 5**, дзе размешчаны факультэты пачатковай адукацыі і фізічнага выхавання. Для правядзення ў памяшканні мерапрыемстваў міжнароднага ўзроўню ў ім плануецца ўстанавіць сістэму відэаканферэнцсувязі і абсталяванне для ажыццяўлення сінхроннага перакладу на дзве мовы.

На базе **аграбіястанцыі БДПУ «Зялёнае»** стартаваў комплекс мерапрыемстваў па вырошчванні якаснага пасадачнага матэрыялу хмызняковых і іглічных культур. На дадзеным этапе рэалізацыі праекта ўжо выкананы самыя працаёмкія работы: заліты падмурак, устаноўлена стацыянарная цяпліца даўжынёй 20 і шырынёй 7 метраў. У будучым плануецца стварыць паўнавартасны парніковы комплекс па вырошчванні дэкаратыўных саджанцаў, каб атрымліваць эканамічны эфект ад рэалізацыі прадукцыі.

Завершана добраўпарадкаванне тэрыторыі, замацаванай за **вучэбным корпусам № 9**.



У прыватнасці, адрамантавана асфальтавае пакрыццё, абсталявана аўтамабільная паркоўка на 26 месцаў.

У **вучэбных карпусах № 1, 2, 3, 8** зроблены рамонт шэрагу аўдыторый і кабінетаў. У рамках стварэння «Педагагічнага *STEAM*-парку» на фізіка-матэматычным факультэце адкрыты цэнтр дэманстрацыі фізічных доследаў і лабараторыі лічбавага мадэлявання фізічных працэсаў, набыты 18 ПЭВМ, 15 ноўтбукаў і шэраг лічбавых лабараторый.

Для факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій у **вучэбным корпусе № 2** выкананы рамонт 3 кабінетаў кафедры педагогікі, а таксама 4 аўдыторый у **вучэбным корпусе № 8**.

На факультэце дашкольнай адукацыі ў **вучэбным корпусе № 11** рэалізуецца сумесны праект БДПУ і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) па стварэнні цэнтра сучасных методык выхавання і навучання дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. Рамонтныя работы выконваюцца за кошт уласных сродкаў БДПУ, абсталяванне ж плануецца набыць пры фінансавай падтрымцы ЮНІСЕФ. Праект будзе рэалізаваны да канца 2020 г.

Што тычыцца структурных падраздзяленняў, то для цэнтра студэнцкай творчасці выкананы рамонт аўдыторыі № 500, для ЦРІТ створаны Рэсурсны цэнтр педагогікі электроннага навучання ў аўдыторыі № 202 (**вучэбны корпус № 2**), у гасцініцы «Універсітэцкая» адрамантаваны 13 жылых памяшканняў (**вучэбны корпус № 9**).

Сёлета абноўлены мэбляй і даабсталяваны (маніторамі, камерай, мікрафонам і інш.)



кабінет № 42 (**вучэбны корпус № 1**), які выкарыстоўваецца як канферэнц-зала БДПУ.

Што да падрыхтоўкі інтэрнатаў да новага навучальнага года, то сіламі супрацоўнікаў студгарадка былі праведзены работы па абнаўленні карпусоў: замена няспраўнага сантэхнічнага і электраабсталявання, устаноўка новых электрапліт, касметычны рамонт кухняў, туалетаў, трэнажорных залаў, пакояў самападрыхтоўкі, лесвічных маршаў і калідораў.

Па ініцыятыве рэктара БДПУ А.І. Жука банерамі са спартыўнай тэматыкай афармлены аб'екты спарткомплексу ўніверсітэта.

Другая частка выступлення А.А. Юшчыка датычыла праектаў, якія не планаваліся да рэалізацыі ў бягучым годзе, аднак былі выкананы. Іх важнасць для ўніверсітэта відавочная.

— Кладкай падлогі керамагранітнай пліткай (160 м²) завяршыліся работы па стварэнні адзінага стылю на калідорах і ў холе сталовай гандлёвага комплексу па вул. Савецкая, 18. На калідорах трох паверхаў **вучэбнага корпуса № 2** заменены 60 аконных блокаў.

Працягваюцца работы і па добраўпарадкаванні тэрыторый, прылеглых да вучэбных карпусоў і інтэрнатаў БДПУ. Пастаянна вядуцца работы па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні ўніверсітэта, закупка мэблі па заяўках інстытутаў, факультэтаў і структурных падраздзяленняў.

БДПУ падключыўся да рэалізацыі інвестыцыйнага праекта Сусветнага банка «Мадэрнізацыя вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь» і па памерах фінансавання займае 3-ю пазіцыю сярод 26 заяўленых установ



адукацыі. У рамках праекта будуць створаны і аснашчаны неабходным абсталяваннем: вучэбна-даследчая лабараторыя лічбавай электронікі, вучэбныя лабараторыі методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, цэнтр калектыўнага карыстання (вучэбна-метадычная лабараторыя музычнай творчасці і музычна-камп'ютарных тэхналогій), *STEAM*-цэнтр факультэта прыродазнаўства, вучэбная лабараторыя методыкі выкладання біялогіі і хіміі, вучэбна-даследчая лабараторыя праблем маўлення і камунікацый.

У рамках падкампанента «Мадэрнізацыя матэрыяльнай базы вучэбна-адукацыйнага асяроддзя» будзе цалкам выкананы капітальны рамонт і мадэрнізацыя **вучэбных карпусоў № 5, 7, 11**. Праект стартуе ў БДПУ ў 2021 г., а завершыцца ў 2025-м. Па выніках яго рэалізацыі значна палепшыцца вучэбна-



тэхнічная база ўніверсітэта, што дазволіць яму забяспечваць арганізацыю адукацыйнага працэсу на сучасным узроўні.

* * *

Інфармацыю, выкладзеную ў дакладзе прарэктара БДПУ А.А. Юшчыка, члены рэктарата прынялі да ведама.

ПЕРШЫЯ КРОКІ Ў ПРАФЕСІІ:

Штогод выпускнікі БДПУ, годна вытрымаўшы дзяржаўныя экзамены, прыступаюць да самастойнай прафесійнай дзейнасці на першым працоўным месцы. За плячыма яны маюць трывалую базу ведаў і кампетэнцый, набытую за гады навучання ва ўніверсітэце, а таксама немалы практычны вопыт. І ўсё ж гэты пераход у новы статус заўжды такі хвалюючы... «Н» паразмаўляў з выхаванцамі БДПУ – маладымі спецыялістамі, якія з 1 верасня пачалі працаваць у школах рэспублікі, і высветліў, якія цяжкасці і радасці сустрэліся ім за гэты невялікі, але важны перыяд.

Кацярына ЯСКЕВІЧ — яшчэ нядаўна старшакурсніца факультэта пачатковай адукацыі — сёння працуе настаўніцай у ДУА «Пачатковая школа № 29 г. Мінска імя братоў



Сянько». Расказваючы пра першы вопыт, малады спецыяліст не хавае ўзрушанасці:

— Здаецца, толькі ўчора мы пераступілі парог універсітэта... А заraз я сама адкрываю дзверы сваім першым вучням, каб увайсці ў іх жыццё і назаўсёды застацца ў памяці як Першая настаўніца.

Вядома, напачатку я вельмі хвалявалася. «Як прымуць бацькі школьнікаў маладога і яшчэ неспрактыкаванага педагога? Што скажуць калегі? Якая атмасфера пануе ў новым для мяне калектыве?» Гэтыя і многія іншыя пытанні моцна заселі ў галаве. Аднак усе страхі зніклі ўжо пасля першага тыдня работы. Больш вопытныя настаўнікі, гледзячы на мяне, узгадвалі свае першыя нясмелыя крокі ў прафесіі і па-добраму, шчыра прапаноўвалі дапамогу. Такая падтрымка вельмі каштоўная, і я ўдзячна сваім калегам за сардэчны прыём.

Веру ў асабістыя сілы і адчуванне цвёрдай глебы пад нагамі мне надае і багаж ведаў, атрыманы за чатыры гады навучання на факультэце. Магу з упэўненасцю сказаць, што ў школу я прыйшла падрыхтаванай. За гэта вялікі дзякуй усяму выкладчыцкаму складу роднага ФПА!


Асобны дзякуй **А.С. Васілеўскай**, якая здолела перадаць нам сваю любоў да роднай мовы, на асабістым прыкладзе паказала, што вучыць і вучыцца можна адначасова прадуктыўна і з цікавасцю. Алена Станіславаўна адкрыла для мяне свет навуковай дзейнасці. Разам з ёй я паглыблялася ў вывучэнне методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры, пад яе кіраўніцтвам удзельнічала ва ўніверсітэцкіх і рэспубліканскіх студэнцкіх навуковых канферэнцыях, публікавала артыкулы, займалася напісаннем курсавой і дыпломнай работ, набывала вопыт, які сёння дапамагае мне выбіраць кірунак прафесійнага развіцця.

Таксама не магу не ўзгадаць **Н.М. Антановіч**, выкладчыцу методык выкладання рускай і беларускай моў і літаратур. Наталля Міхайлаўна дзялілася з намі, сваімі студэнтамі, грунтоўнымі ведамі, стварала аснову, без якой немагчыма стаць паспяховым педагогам. Выказваю падзяку выкладчыку дысцыпліны «Дзіцячая літаратура» **А.Л. Царкоўскаму** — за тое, што вучыў нас чытаць паміж радкоў, не толькі глядзець вачыма, але адчуваць сэрцам; **І.А. Буторынай** — за яе невычэрпныя творчыя ідэі, многія з якіх цяпер я сама выкарыстоўваю на практыцы.

Кожны выкладчык зрабіў важкі ўнёсак у станаўленне нас і як педагогаў, і як асоб, за што мы ім будзем заўсёды ўдзячныя!

Выпускнік факультэта прыродазнаўства Юрый ЮРЧЫК быў размеркаваны ў ДУА «Красненскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа». Малады спецыяліст з цеплынёй узгадвае гады навучання і асобаснага развіцця ў БДПУ:

— Мне заўсёды падабалася назіраць за філіграннай працай маіх школьных настаўнікаў. Кожны ўрок



ІНТАРЭСЫ СТУДЭНТАЎ – НАШ ПРЫЯРЫТЭТ



Ужо шмат гадоў пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў (далей — ППА студэнтаў) падтрымлівае імідж самай уплывовай. Прафбюро ўдзельнічае ў вырашэнні такіх пытанняў, як забеспячэнне сваіх членаў месцам у інтэрнаце, аздараўленне, матэрыяльнае заахвочванне, медыцынскае абслугоўванне і інш. Самыя ж важныя рашэнні прымае прафкам (вучэбны корпус № 1, каб. № 86, 87, тэл. 8-017-226-40-17, 8-044-537-52-60), у склад якога ўваходзяць прафсаюзныя лідары ўсіх факультэтаў і інстытутаў. Акрамя дапамогі ў абароне сваіх правоў у прафсаюзным камітэце вы зможаце атрымаць бясплатную кансультацыю па любых сацыяльных пытаннях. Зразумела, што вырашэнне многіх задач патрабуе кампетэнтнага падыходу, таму прафкам актыўна і плённа супрацоўнічае з рэктаратам БДПУ, а прафбюро — з адміністрацыяй свайго інстытута або факультэта.

Паважаныя першакурснікі! Хутка ў вас узнікне неабходнасць выбраць прафсаюзнага лідара вучэбнай групы. Пажадана, каб ім стаў чалавек не толькі шчыры і адказны, але актыўны і камунікабельны, здольны своечасова выяўляць і вырашаць праблемы, што ўзнікаюць у студэнцкім калектыве. Рабіце свой выбар з максімальнай свядомасцю! І, безумоўна, уступайце ў прафсаюз: гэта ў вашых жа інтарэсах!

ППА студэнтаў БДПУ падтрымае вашы ініцыятывы і фінансава дапаможа рэалізаваць цікавыя праекты. Акрамя таго, для актывістаў і членаў прафсаюза мы арганізуем экскурсійныя паездкі па нашай цудоўнай краіне, а таксама наведванне тэатральных пастановак, канцэртаў, спартыўных мерапрыемстваў. Знаходзьце нас у сацыяльных сетках *ВКонтакте (profbspu)* і *Instagram (@sprof.bspu)*. Будзьце з намі, і вы адчуеце сябе ў кагорце сяброў!

Вольга ДЫМКОВА,
старшыня прафкама студэнтаў

На працягу многіх гадоў наш універсітэт падтрымлівае імідж установы, калектыў якой з'яўляецца прыхільнікам здаровага ладу жыцця. Так, у БДПУ функцыянуюць стадыён і тры спартыўныя залы, размешчаныя ў адміністрацыйным корпусе. Акрамя таго, адкрыты спартыўны цэнтр, які ўключае басейн і трэнажорныя залы, залы для заняткаў адзінаборствамі, фітнесам і аэробікай, а яшчэ шэраг прыстасаваных памяшканняў для аматараў настольнага тэнісу і шэйпінгу. На базе студэнцкага гарадка працуюць 18 спартыўных секцый: атлетычнай гімнастыкі, аэробікі, більярда, шашак, шахмат, дартсу і інш.

РАДЫ ТЫМ, ХТО СЯБРУЕ СА СПОРТАМ



Штогод ва ўніверсітэце праводзіцца звыш 45 мерапрыемстваў фізкультурна-аздараўленчай і спартыўнай накіраванасці. Традыцыйнымі сталі: спартакіяда БДПУ і спартакіяда студэнцкага гарадка, спартландыя для першакурснікаў, свята «Трыумф», прысвечанае падвядзенню спартыўных вынікаў года, спаборніцтвы па плаванні пад дэвізам «Стартуем разам!», прысвечаныя Дню ўніверсітэта, «Гарбузовыя забаўкі» ў рамках праекта «Гарбузовы фэст», спаборніцтвы па беларускіх народных гульнях у рамках спартыўна-адукацыйнага праекта «Беларусіяда» і многія іншыя.

У БДПУ паспяхова рэалізуюцца два галоўныя спартыўныя дэвізы: «Будучыя педагогі — за здаровы лад жыцця!» і «Праз спорт — да здароўя!».

Нароўні са статусам вядучага педагагічнага ўніверсітэта краіны БДПУ штогод даказвае, што па праву называецца і адной з самых спартыўных устаноў рэспублікі. Гэта пацвярджаюць дасягненні зборных каманд *alma mater* у Рэспубліканскай універсіядзе па баскетболе, футболе і міні-футболе, гандболе, валейболе, вольнай барацьбе, барацьбе дзюдо і самба, біятлоне, лыжных гонках і многіх іншых відах спорту. Наш універсітэт з'яўляецца самым масавым удзельнікам лёгкаатлетычнага свята «Мінскі паўмарафон» на працягу 5 гадоў, пастаянным удзельнікам спаборніцтваў па лыжных гонках «Мінская лыжня».

Запрашаем вас, шаноўныя першакурснікі, далучацца да здаровага ладу жыцця і рэгулярных заняткаў фізічнай культурай. Разам — да новых перамог!

Іван МОРГУН,
начальнік спартыўнага клуба «Педагог»

БРСМ: ПАКАРАЕМ ВЯРШЫНІ РАЗАМ!

Працаздольнасць, таварыскасць, актыўнасць, аптымізм, упэўненасць у сабе, мэтанакіраванасць, наяўнасць высокіх маральных прынцыпаў – гэта якасці паспяховага спецыяліста, развіццю якіх спрыяе ПА ГА «БРСМ» БДПУ.

Многія ўступілі ў шэрагі БРСМ яшчэ ў школе. Але пасапраўднаму самастойнае і насычанае жыццё пачынаецца менавіта ў перыяд вучобы ва ўстановах вышэйшай адукацыі. «БРСМ» БДПУ — гэта вялікая і дружная сям'я аднадумцаў, якая налічвае ў сваіх шэрагах больш за 3500 чалавек. Мы падтрымліваем тых, хто не сядзіць склаўшы рукі, а гатовы прымяніць свае здольнасці, каб зрабіць жыццё цэлага ўніверсітэта больш цікавым, яркім і асэнсаваным.

Найважнейшы напрамак нашай работы — студатрадаўскі рух. Дзякуючы яму маладыя людзі атрымліваюць карысны жыццёвы вопыт, у тым ліку ў сферы арганізацыі, кіравання і планавання. Штогод дзейнасць штаба працоўных спраў і педагагічных атрадаў БДПУ адзначаецца высокімі ўзнагародамі і падзякамі на ўзроўні рэспублікі.

Праявай грамадзянскай пазіцыі педагога з'яўляецца ўдзел у валанцёрскім руху. У нашай пярвічцы сфарміравана і дзейнічае арганізацыя «Добрае Сэрца», у склад якой уваходзяць 77 чалавек. Дабрачынныя маладзёжныя ініцыятывы спрыяюць наладжванню трывалых сувязяў з установамі адукацыі, грамадскімі аб'яднаннямі. Праца валанцёраў БДПУ высока цэніцца. Так, студэнтка факультэта дашкольнай адукацыі Віялета Аляшкевіч перамагла ў намінацыі «За асабісты ўклад сярод студэнтаў установы вышэйшай адукацыі» на рэспубліканскім этапе конкурсу «Валанцёр года-2019».

Сёння на рахунку арганізацыі шмат цікавых спраў. Асабліве месца сярод іх займае праект «100 ідэй для Беларусі», у рамках якога кожны жадаючы можа прэзентаваць сваю ідэю, а затым яе ажыццявіць. Таксама мы садзейнічаем развіццю ініцыятывы і прадпрымальніцтва сярод нашых студэнтаў.



Членства ў БРСМ дазволіць вам паспрабаваць сілы ў розных сферах, навучыць распрацоўваць неабходны план дзеянняў, выконваць разнастайныя задачы, праяўляць волю, стараннасць і творчыя здольнасці, кантактаваць з людзьмі, набываць вопыт работы ў камандзе. Вядома, усё будуецца на прынцыпе добраахвотнасці: мы не прымушаем, але стараемся зацікавіць сваімі справамі і ўчынкамі, паказаць асабісты прыклад. Калі вы жадаеце пазнаёміцца з нашай дзейнасцю, быць у курсе апошніх падзей, даведацца пра акцыі і мерапрыемствы, то зрабіць гэта можна на старонках у сацыяльных сетках *(ВКонтакте: https://vk.com/bspu_brsm* і *Instagram: @bspu.brsm)*.

Грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» не стаіць на месцы. Мы ўпэўнена ідзём у нагу з часам, адпавядаем модным трэндам, шануем, захоўваем і памнажаем нашы традыцыі, рыхтуемся з новымі ідэямі і праектамі адзначыць 18-годдзе нашай арганізацыі. Давайце пакараць вяршыні разам!

Аляксандр ДАВЫДОЎСКІ,
сакратар ПА ГА «БРСМ»

САМАСТОЙНА І ДАСТОЙНА!

быў нібы добра адрэпеціраваны канцэртны нумар: мы, вучні, — аркестр, а педагог — дырыжор. Заняткі, якія праводзіла з намі настаўніца хіміі (дарэчы, выпускніца факультэта прыродазнаўства), а таксама іншыя педагогі, выдатна памятаю і сёння. З выбарам спецыяльнасці і навучальнай установы ваганняў не было...

Цалкам падтрымліваю ініцыятыву ўніверсітэта па стварэнні спрыяльных умоў для асобаснага росту сваіх выхаванцаў, развіцця іх творчага патэнцыялу і, безумоўна, авалодання прафесійнымі навыкамі. Навучаючыся ў БДПУ, я меў унікальную магчымасць праявіць сябе як у сценах *alma mater*, так і на мерапрыемствах гарадскога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Хачу падкрэсліць, што наш універсітэт прагрэсіўны, ідзе ў нагу з часам. Усе лекцыйныя, семінарскія і лабараторныя заняткі былі карысныя і пазнавальныя, школьныя і палявыя практыкі — цікавыя і непаўторныя.

І вось я — уладальнік дыплома БДПУ, свайго шчаслівага білета — пад'язджаю да школы, якая стане маім першым працоўным месцам... Знаёмства пачалося з эстэтычнага захаплення: тэрыторыя ўстановы з густам аздоблена дэкаратыўнымі элементамі (клумбы, аркі, альтанкі, лавачкі) і раслінамі: вербы, туі, ядлоўцы, рознакаляровыя ружы і нават невялікі яблыневы сад...

Думаю, што любы спецыяліст у пачатку прафесійнага шляху адчувае пэўныя цяжкасці. У мяне ж яны з лішкам кампенсуюцца жаданнем калег дапамагчы ў вырашэнні той ці іншай задачы, падзяліцца неацэнным вопытам шматгадовай, выніковай працы. Адміністрацыя ахвотна падтрымлівае і стымулюе ўсе пачынанні (гурткі, факультатывы, навукова-даследчую дзейнасць). Кантактаваць з дзецьмі часам нялёгка, да кожнага трэба знайсці індывідуальны падыход, але як жа прыемна бачыць зацікаўленыя вочы чалавека, ад якога будзе залежыць наша будучыня! Кожны дзень непрадказальны, гэтым наша праца найперш і адметная.

Малады спецыяліст Алена ТАКАРЧЫК сёлета скончыла **факультэт прыродазнаўства** па спецыяльнасці *«Біялогія і хімія»*. Паўгода сумяшчала вучобу з працай у мінскай СШ № 143 імя М.А. Ауэзава, што, па прызнанні выпускніцы, значна палегчыла першыя тыдні на новым месцы:

— Адміністрацыя і педагагічны калектыў Астрашыцка-Гарадоцкай сярэдняй школы сустрэлі мяне добразычліва, з гатоўнасцю кансультавалі. Класныя кіраўнікі і настаўнікі-прадметнікі давалі слушныя парады, дапамагалі з афармленнем дакументацыі, тлумачылі спецыфіку працы і шмат іншага. Так, пагаджуся, вялікая колькасць так званай папяровай працы. І гэта тое, з чым трэба будзе сутыкнуцца кожнаму маладому спецыялісту.



Што да знаёмства з дзецьмі і наступнага з імі ўзаемадзеяння, то, лічу, гэтага не варта баяцца. Вучні таксама не ведаюць, чаго ад вас чакаць. Нам усім давядзецца разам прайсці перыяд адаптацыі, прывыкання адзін да аднаго. Таму так важна захапіць школьнікаў сваім прадметам, стаць для іх цікавым як асоба. І вось да гэтага якраз вельмі добра рыхтуюць у БДПУ. Зусім апраўдана, што студэнты ўніверсітэта шмат часу праводзяць ва ўстановах адукацыі на розных відах практык — валанцёрскіх, азнаямленчых, вытворчых. Зараз я вяду ўрокі біялогіі ў дзяцей старэйшага школьнага ўзросту, адначасова працую з вучнямі 6-х класаў. Набываю вопыт узаемадзеяння з малодшымі школьнікамі: кірую аб'яднаннем па інтарэсах. Гэта таксама вялікі плюс: бліжэй знаёмлюся з дзецьмі, якія праз некалькі гадоў прыйдуць да мяне на ўрокі біялогіі, а я працягну развіваць іх патэнцыял і пазнавальны інтарэс. У працы з высокаматываванымі вучнямі мне дапамагае той багаж ведаў, які я атрымала, займаючыся навуковай дзейнасцю на факультэце прыродазнаўства ў складзе СНДЛ «Рэгуляцыя росту раслін» пад кіраўніцтвам дацэнта **Ж.Э. Мазец**. Напрыклад, па выніках вывучэння ўплыву электрамагнітнага выпраменьвання на фізіялагічныя працэсы грэчкі пасяўной я апублікавала шэраг артыкулаў. А зараз дзялюся вынікамі даследавання з вучнямі, каб яшчэ больш зацікавіць іх прадметам.

АДПАЧЫНАК І ЛЯЧЭННЕ КРУГЛЫ ГОД

Нават самаму руплівому студэнту патрэбен адпачынак. Напружаны рытм вучобы і фінансавае становішча рэдка дазваляюць маладым людзям кінуць усё і з'ехаць куды-небудзь на ўзбярэжжа. Аднак перазагрузіцца і аднавіць жыццёвую энергію ўсё ж магчыма. Студэнцкі санаторый-прафілакторый БНТУ «Палітэхнік» і санаторый «Зялёны Бор» запрашаюць прадстаўнікоў нашага ўніверсітэта адпачыць і ўмацаваць сваё здароўе.

Паважаныя студэнты! Прапануем вам на 18 дзён паглыбіцца ў атмасферу здаровага ладу жыцця — па даступнай цане і без адрыву ад працэсу навучання. Абодва санаторыі знаходзяцца недалёка ад Мінска, аснашчаны сучасным медыцынскім абсталяваннем, прапануюць рассяленне па 2—3 чалавекі і чатырохразовае харчаванне. Для моладзі арганізуюцца вечарыны, дыскатэкі і многае іншае. Паміж санаторыямі і Мінскам некалькі разоў на дзень курсіруе бясплатны аўтобус, на якім без праблем можна дабрацца на заняткі. Таксама ходзіць грамадскі транспарт.

У «Палітэхніку» аздараўляюцца студэнты з 18-гадовага ўзросту — пры наяўнасці захворванняў сістэмы кровазвароту, нервовай і касцёва-мышачнай сістэм, органаў дыхання, страваванне і злучальнай тканкі. Хоць поўны кошт пуцёўкі складае 583,00 руб., 85% пакрываецца сродкамі рэспубліканскага бюджэту. Таму студэнт аплочвае толькі 87 руб. 45 кап.

У санаторый «Зялёны Бор» могуць паехаць і непаўналетнія, аднак дадаткова патрабуецца даведка аб тым, што студэнту не вылучалася пуцёўка па месцах працы бацькоў. Лячэнне праводзіцца пры наяўнасці захворванняў сістэмы кровазвароту і нервовай сістэмы. Тут таксама давядзецца заплаціць толькі 15% кошту пуцёўкі — 87 руб. 77 кап. замест 585,11 руб.



Варта дадаць, што прафкам студэнтаў БДПУ дапамагае членам прафсаюза зрабіць адпачынак яшчэ больш танным праз аказанне матэрыяльнай дапамогі пасля вяртання з санаторыя.

Сваімі ўражаннямі дзеляцца танкаўцы, якія ўжо скарысталіся выдатнай магчымасцю аздараўлення.

Эрнесціна Каляда, студэнтка 2-га курса факультэта эстэтычнай адукацыі: «Вялікі дзякуй калектыву санаторыя „Зялёны Бор“ за адпачынак і ўвагу да нашых патрэб, медыцынскаму персаналу — за лячэнне і цудоўны аздараўленчы эфект ад працэдур, паварам — за разнастайны і смачны шведскі стол. Мы жылі ў апартаментах блочнага тыпу з добрым рамонтам, кухняй і ванным пакоем. Бавілі час на спартыўных пляцоўках, гулялі ў настольны тэніс, більярд, танчылі на дыскатэках. Асабіста я абавязкова вярнуся сюды сама і яшчэ прывязу як мага больш сяброў».

Крысціна Казбяровіч, студэнтка 4-га курса Інстытута інклюзіўнай адукацыі: «У санаторыі-прафілакторыі БНТУ „Палітэхнік“ — адным з лепшых месцаў адпачынку студэнтаў — я была тройчы. Сёлета склалася кампанія, якой мы планавалі заехаць на змену разам. Аднак эпідэміялагічная сітуацыя трохі „завірусавала“ нашы планы... Гэта не перашкодзіла атрымаць асалоду ад адпачынку, а галоўнае, займець новых сяброў. Тут вельмі смачна і сытна кормяць. Медыцынскі персанал ветлівы, старанна сочыць за здароўем студэнтаў і прызначае працэдуры, пачынаючы ад інгаляцый і заканчваючы падводным масажам. Абавязкова прыеду яшчэ і вам раю!»



Анастасія Сафонава, студэнтка 4-га курса філалагічнага факультэта: «Санаторый-прафілакторый „Палітэхнік“ дае цудоўную магчымасць пабыць на прыродзе, расслабіцца, папраўіць здароўе. Гэта ідэальнае месца для студэнтаў, у якіх заўсёды не хапае грошай на дарагі адпачынак. Асабіста я набывала пуцёўку тройчы. *Па-першае*, таму што туды зручна дабірацца. Кожную раніцу ў Мінск ідзе аўтобус, прычым бясплатны, а пасля заняткаў ён вяртае цябе назад. *Па-другое*, тут цудоўная лячэбна-аздараўленчая база. Дзякуючы ўрачу і назначаным працэдурам я вылечылася ад фарынгіту! Што датычыцца харчавання, то гэта проста рай для тых студэнтаў, хто жыве ў інтэрнаце і гатуе самастойна. У санаторыі неверагодна смачныя і сытныя стравы! Гэта было *па-трэцяе*. А, *па-чацвёртае*, кожны дзень пасля вячэры пачыналіся мерапрыемствы — тэматычныя вечарыны, дыскатэкі, сумесныя прагляды фільмаў, вячоркі ля вогнішча, квэсты... Дзякуючы паездцы ў санаторый-прафілакторый я змагла пазнаёміцца са студэнтамі з іншых універсітэтаў, з якімі падтрымліваю зносіны і па сённяшні дзень. Шкада толькі, што прыехаць сюды можна ўсяго адзін раз на год».

Каб атрымаць пуцёўку, неабходна афарміць медыцынскую даведку ў паліклініцы па месцы жыхарства (або ў 33-й студэнцкай), а затым падаць заяву ў камісію па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні (вучэбны корпус № 3, каб. 324, тэл.: 8-017-327-83-67).



Ксенія КРУПСКАЯ,
загадчыца сектара сацыяльнай работы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю

• **Маладая змена**

ВУЧЫМСЯ, ЗНАЁМІМСЯ, СЯБРУЕМ

Імклівае і насычанае ўніверсітэцкае жыццё паспела адкрыцца перад намі, першакурснікамі, ва ўсіх сваіх разнастайных праявах. Прыемна, што адміністрацыя БДПУ стараецца далучыць нас не толькі да адукацыйнага працэсу, але і да пазавучэбнай дзейнасці. Гэта спрыяе лепшай адаптацыі да новых умоў, дапамагае наладжваць міжасобаснае ўзаемадзеянне. Адно з такіх мерапрыемстваў, пра якое хачу расказаць, – адукацыйны квэст «Мэты ўстойлівага развіцця: Шлях наперад 2.0», арганізаваны Каардынацыйным цэнтрам «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» БДПУ і міжуніверсітэцкім клубам сяброў Мэт устойлівага развіцця.

У мерапрыемстве бралі ўдзел 6 каманд з розных факультэтаў. Наш, гістарычны, быў прадстаўлены дзвюма камандамі. Пасля знаёмства з асноўнымі сэнсамі 17 Мэт устойлівага развіцця (МУР) нам патлумачылі правілы і задачы квэста. Мы атрымалі маршрутныя лісты і накіраваліся... у лабірынт БДПУ.

Каманды знаходзілі патрэбныя аўдыторыі, хоць і не адразу — зразумела ж, першакурснікі. Падчас першага выпрабавання "Імправізацыя" кожнаму ўдзельніку неабходна было патлумачыць сваёй камандзе выяву адной з 17 МУР — вядома, апісальна, не называючы адлюстраваны прадмет ці з'яву прама. На другім этапе "Бліц-тур" каманды адказвалі на пытанні,



выконвалі цікавыя заданні — напрыклад, суаднесці якое-небудзь дзеянне або паняцце з яго англійскім аналагам. Падчас выпрабавання «25 кадр» мы распрацоўвалі сумесныя ініцыятывы па паляпшэнні якой-небудзь сферы жыцця. Наш праект быў накіраваны на павышэнне цікавасці да гісторыі Мінска. Так, каманда прапанавала стварыць экскурсійную групу, каб дзяліцца фактамі і звесткамі пра сталіцу не толькі са студэнтамі, але і з мінчанамі, гасцямі горада. Лічу гэта правільным, бо гісторыя — глыбокая, цікавая і павучальная навука.

Многія заданні аказаліся не толькі пазнавальнымі, але і арыгінальнымі. Так, на этапе "МУР у сэнсах" патрабавалася жэстамі патлумачыць капітану каманды, які быў у навушніках, сутнасць пэўнай з'явы, якая датычыцца ўстойлівага развіцця. Паказаць некаторыя рэчы было нялёгка, але наша кемлівасць не ведала межаў. Напрыклад, дэманструючы гендарную роўнасць, я сагнуўся, каб аказацца аднолькавага росту з адзінай дзяўчынай у нашай камандзе. На заключным выпрабаванні «Што? Дзе? Калі?» мы круцілі барабан і адказвалі на пытанні пра МУР. Усё было даволі аператыўна, і проста, калі «ўключалі логіку».

Напрыканцы мерапрыемства ўсе ўдзельнікі прадставілі свае праекты, адказалі на пытанні і абмеркавалі план іх рэалізацыі. Арганізатары падзякавалі нам, уручылі сертыфікаты, прызы і правялі памятную фотасесію.

Падчас квэста мы праявілі кемлівасць, развілі навыкі ўзаемадзеяння, бліжэй пазнаёміліся. І зрабілі выснову: удзельнічаць у такіх мерапрыемствах трэба абавязкова! Асабліва ў адукацыйных, бо спасцігаць новае варта заўсёды і ўсюды.

Валерый ЕРМАКОВІЧ, гістарычны факультэт

ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК для першакурсніка

РЭКТАР (ад лац. *rector* — «правіцель») — кіраўнік універсітэта.
«Н»-даведка. Рэктар БДПУ — прафесар Аляксандр Іванавіч Жук.
ПРАРЭКТАР — намеснік рэктара па пэўным напрамку работы.
«Н»-даведка. У рэктара БДПУ 5 намеснікаў. Гэта — першы прарэктар Святлана Іванаўна Копцева, а таксама прарэктары па вучэбнай, навуковай, інфармацыйна-аналітычнай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце.
ФАКУЛЬТЭТ (ад лац. *facultas* — «магчымасць», «здольнасць») — вучэбна-навуковае і адміністрацыйнае структурнае падраздзяленне ўніверсітэта, якое ажыццяўляе падрыхтоўку студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў па адной або некалькіх блізкіх спецыяльнасцях, павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў, а таксама кіраўніцтва навукова-даследчай дзейнасцю кафедраў.
«Н»-даведка. У структуры ўніверсітэта функцыянуюць 10 факультэтаў, 2 інстытуты і Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ.
ДЭКАН (ад грэч. — «дзесяць», «дзясятнік») — кіраўнік факультэта, які адказвае за вучэбную, выхаваўчую і навуковую дзейнасць.
ДЭКАНАТ — арганізацыйны цэнтр па кіраванні работай факультэта, які ўзначальвае дэкан. Дэканат выконвае функцыі каардынацыі і адміністрацыйнага забеспячэння вучэбнага працэсу, кантролю за ажыццяўленнем навуковай і пазавучэбнай дзейнасці; тут складаецца расклад заняткаў.
КАФЕДРА — гэта структурнае падраздзяленне ўніверсітэта, якое ажыццяўляе падрыхтоўку студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў у рамках пэўнай спецыялізацыі. Кафедру ўзначальвае загадчык, часцей за ўсё прафесар.
«Н»-даведка. У БДПУ створаны і плённа працуюць 43 кафедры.
ПРАФЕСАР (ад лац. *professor* — «выкладчык») — гэта пасада выкладчыка высокага ўзроўню кампетэнтнасці, спецыяліста, які з'яўляецца экспертам у пэўнай галіне навукі і валодае педагагічным майстэрствам. Акрамя таго,
ПРАФЕСАР — гэта вучонае званне, што прысвойваецца доктару навук, які вядзе педагагічную дзейнасць ва ўстановах вышэйшай адукацыі і мае навуковыя дасягненні.
«Н»-даведка. Вучонае званне «прафесар» прысвойваецца пажыццёва, а пасада прадастаўляецца на пэўны перыяд.
ДАЦЭНТ (ад лац. *docere* — «навучаць») — гэта пасада выкладчыка ўніверсітэцкай кафедры, які выконвае функцыю лектара, а таксама вучонае званне, якое прысвойваецца кандыдату навук.
ЛЕКЦЫЯ (ад лац. *lectio* — «чытанне») — вуснае сістэматычнае і паслядоўнае выкладанне матэрыялу выкладчыкам па пэўнай тэме або праблеме на групавых вучэбных занятках. Матэрыял лекцыі замацоўваецца на семінарах.
СЕМІНАР (ад лац. *seminarium* — «расаднік», «цяпліца») — эфектыўная форма правядзення вучэбна-практычных заняткаў, падчас якой студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыка абмяркоўваюць падрыхтаваныя загадзя паведамленні, даклады, рэфераты. Семінары бываюць вучэбныя (арганізуюцца ў акадэмічнай групе для лепшага засваення тэмы) і інтэрактыўныя, якія праходзяць у рэжыме анлайн (вэбінары, вэб-канферэнцыі і інш.).
ВАЛАНЦЁР (ад лац. *voluntarius* — «добраахвотны») — гэта чалавек, які па ўласнай волі займаецца добрымі справамі на карысць грамадства. Дзейнасць валанцёраў накіравана ў першую чаргу на дапамогу тым, хто мае ў ёй вострую патрэбу, бо не ў стане справіцца з цяжкасцямі самастойна.
«Н»-даведка. У БДПУ 1,5 тыс. валанцёраў, якія ўваходзяць у склад 14 валанцёрскіх клубаў і аб'яднанняў.
ЦЬЮТАР (ад англ. *tutor* — «настаўнік») — гэта педагог-памочнік, які праводзіць індывідуальную адукацыйную работу, суправаджае студэнта па яго ўласнай вучэбнай траекторыі. Цьютар — бліжэйшы дарадчык першакурсніка, які не паспеў адаптавацца да навучання ва ўніверсітэце, або студэнта, што не спраўляецца з вучэбнай нагрузкай, бо мае прабелы ў ведах, — любога навучэнца, які не ў стане паспяхова арганізаваць сваю вучэбную дзейнасць.
«Н»-даведка. Цьютары БДПУ — гэта студэнты старшых курсаў, заўтрашнія педагогі, якія дапамагаюць сваім малодшым таварышам па прынцыпе «роўны навучае роўнага».

• **Аддзел кадраў**

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне пасад педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу з заключэннем кантракта на тэрмін, вызначаны наймальнікам:

загадчыкаў кафедраў (д.н., к.н., 13 разр.) клінічнай і кансультатыўнай псіхалогіі, гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, менеджменту і адукацыйных тэхналогій;

прафесара кафедры (д.н., к.н., 12 разр.) агульнай біялогіі і батанікі;

дацэнтаў кафедраў (к.н., 11 разр.) гісторыі Беларусі і славянскіх народаў, сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, методык дашкольнай адукацыі, беларускага і рускага мовазнаўства, мовазнаўства і лінгвадыдактыкі, педагогікі;

старшых выкладчыкаў кафедраў (10 разр.) тэорыі і методыкі выкладання мастацтва, матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі;

выкладчыкаў кафедраў (9 разр.) клінічнай і кансультатыўнай псіхалогіі, замежных моў, агульнай і арганізацыйнай псіхалогіі.

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы. Дакументы прымаюцца ў аддзеле кадраў па адрасе: вул. Савецкая, 18/1, г. Мінск. Тэл. 226-46-59.

НАСТАЎНІК
Заснавальнік — Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка». Пасв. аб рэгістр. № 557.

Пр. Незалежнасці, 1, п. 207А, 220030, Мінск.
8-017-226-40-19
nastaunik__news
e-mail: nastaunik@bspu.by
https://nastaunik.bspu.by

Выходзіць два разы ў месяц на беларускай мове. Аб'ём 4 паласы фармату А3. Распаўсюджваецца ў вучэбных карпусах і інтэрнатах БДПУ бясплатна.

Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «БудМедыяПраект». ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014. Вул. В. Харужай, 13/61, Мінск, 220123. Тыраж 500 экз. Заказ 954. Падпісана ў друк 21.09.2020.

Рэдактар Т. А. БАШМАКОВА